*Пятага сакавіка*

*Класная работа*

# ***Займеннік .***
# ***Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага***

*Мая зямля завецца Беларуссю.*
*Яна, як спадчына, мне ад дзядоў,*
*Дзе б ні была, а сэрцам я гарнуся*
*Да ніў яе, да волатаў-дубоў.*

# ПРАЛЕСКІ







Маю некалькі ў мове нагрузак патрэбных:
Замяняю назоўнік, прыметнік, лічэбнік.



# МЭТЫ ЎРОКА

- узгадаць і абагульніць веды пра займеннік як самастойную часціну мовы;

- удасканальваць уменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго віды, марфалагічныя асаблівасці, вызначаць сінтаксічную ролю ў сказе, ужываць ва ўласным маўленні;

- выхоўваць пачуццё любові да Радзімы, да роднага куточка, дзе нарадзіліся.



# г. ЗАЙМЕННІК



# ПАДАРОЖЖА Ў ГОРАД ЗАЙМЕННІК



# ЭПІГРАФ

Мая зямля завецца Беларуссю.
Яна, як спадчына, мне ад дзядоў,
Дзе б ні была, а сэрцам я гарнуся
Да ніў яе, да волатаў-дубоў.





# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ



- Што такое займеннік?
- На якія разрады паводле значэння падзяляюцца займеннікі?
- Якія займеннікі выкарыстоўваюцца ў мове замест назоўнікаў?
- Які займеннік не мае формы назоўнага склону?
- Што абазначаюць прыналежныя займеннікі? З якімі прыметнікамі яны суадносяцца?
- Чаму лёгка зблытаць адносныя і пытальныя займеннікі?
- На што паказваюць указальныя, азначальныя, адмоўныя і няпэўныя займеннікі?
- Якая роля займеннікаў у мове?

# Прыпынак

# «АСАБОВЫЯ І ПРЫНАЛЕЖНЫЯ ЗАЙМЕННІКІ»



**Заменіце самастойныя часціны мовы на займеннікі (вусна)**

- Міца вярнуўся дахаты вясёлы. Міца ахвотна паказаў дзённік бацькам.
- На 8 Сакавіка дзяўчынкам уручылі падарункі. Падарункі вельмі парадавалі дзяўчынак.
- Шпакі зляцеліся ў чароды, няма шпакоў сёння ў дварах.
- У школу ішла суседская дзяўчынка Света. Света вучыцца ў шостым класе.

**Выразна прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Выпішыце з тэксту прыналежныя займеннікі. Вызначце іх род, лік, склон.**

Мая Беларусь...
Галоўны твой скарб – людзі! Беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў: Сонца – на ўсіх адно, Зямля – адна, трымайся сваёй хаты, беражы свой гонар, не бяры чужое. Ніколі і нікому не зняволіць наш вольналюбівы народ, які ўслаўляе сваю зямлю, гаворыць усяму свету пра добрае сваё імя, імя яго радзімы.

# Правер сябе

Мая (Н., адз.,ж.) Беларусь...
Галоўны твой (Н., адз., м.) скарб – людзі! Беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў: Сонца – на ўсіх адно, Зямля – адна, трымайся сваёй (Р.,адз., ж.) хаты, беражы свой (В., адз., м.) гонар, не бяры чужое. Ніколі і нікому не зняволіць наш (В., адз., м.) вольналюбівы народ, які ўслаўляе сваю (В., адз., ж.) зямлю, гаворыць усяму свету пра добрае сваё (Р., адз., н.) імя, імя яго радзімы.

Прыпынак

«ЗВАРОТНЫ ЗАЙМЕННІК СЯБЕ»



**Замест кропак пастаўце займеннік сябе ў патрэбнай форме.**

З гадамі я навучыўся больш цаніць самога … . Трэба заўсёды старацца трымаць … ў руках. Не магу дараваць … такога неабдуманага ўчынку. Трэба непакоіцца не толькі пра … , і пра іншых. Лепш адмовіць … ў чым-небудзь, чым свайму сябру.

# Правер сябе

З гадамі я навучыўся больш цаніць самога сябе . Трэба заўсёды старацца трымаць сябе ў руках. Не магу даравацць сабе такога неабдуманага ўчынку. Трэба непакоіцца не толькі пра сябе , і пра іншых. Лепш адмовіць сабе ў чым-небудзь, чым сваймy сябру.

# ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА







Прыпынак

«АЗНАЧАЛЬНЫЯ І ЎКАЗАЛЬНЫЯ ЗАЙМЕННІКІ»



**Выпісаць са сказаў указальныя і азначальныя займеннікі. Вызначыць іх род, лік, склон.**

- Сёння гэткі дзівосны дзень!
- Усё жывое на зямлі патрабуе пяшчоты і ласкі.
- Той дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго, што мог.
- Шануем мы светлую, добрую долю, за гэтую долю грудзьмі пастаім.

## Правер сябе

- Сёння гэткі (Н., м., адз.) дзівосны дзень!

- Усё (Н., н., адз.) жывое на зямлі патрабуе пяшчоты і ласкі.

- Той (Н., н., адз.) дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго (Р., н., адз.), што мог.

- Шануем мы светлую, добрую долю, за гэтую (В., ж., адз.) долю грудзьмі пастаім.

Прыпынак

«АДНОСНЫЯ І ПЫТАЛЬНЫЯ ЗАЙМЕННІКІ»



**Выразна прачытайце тэкст. Выпішшыце з тэксту адзін сказ з пытальным займеннікам і адзін з адносным.**

Якая, вы, думаеце самая цікавая кніга на свеце? Адразу не адкажаце, не здагадаецеся. Гэта кніга – зямля, на якой мы жывём і якая з першых год нашага жыцця штодня вучыць нас гісторыі, мове. Яна адкрывае нам усё новыя і новыя словы, значэнне і сэнс якіх мы вучымся спазнаваць і разумець.

Тысячы і мільёны назваў існуе на зямлі. Кожная яе мясціна мае сваю назву.

Добра было б, каб адзін са сваіх сшыткаў вы назвалі "Мая Бацькаўшчына" або "Мой родны кут". У ім запісалі ўсё самае цікавае, пра што дазнаецеся ад старэйшых людзей.

# Прыпынак

## «НЯПЭЎНЫЯ І АДМОЎНЫЯ ЗАЙМЕННІКІ»



**Запішыце сказы, раскрыўшы дужкі, уставіўшы прапушчаныя літары.**

- (Ні)якае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мовую.
- Ціха адчыніліся дзверы, і хтос(?)ці ўвайшоў.
- Раскажы, тата, што(небудзь) цікавае.
- (Не)хта спяшаецца, камус(?)ці не спіцца, (не)кага гоніць радасць адкрыцця.
- Гэта не (абы)што, а падарунак маме.

# Правер сябе

- Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову.
- Ціха адчыніліся дзверы, і хтосьці ўвайшоў.
- Раскажы, тата, што-небудзь цікавае.
- Нехта спяшаецца, камусьці не спіцца, некага гоніць радасць адкрыцця.
- Гэта не абы-што, а падарунак маці.



# ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ

*Пр. 568 (2 сказ), Або*

***Творчае заданне:*** ***напісаць сачыненне на адну з тэм: «Кветкі маёй роднай зямлі», «Мая малая Радзіма»***

